3. Зайцев, В.С. Современные педагогические технологии: учеб. пособие: в 2 книгах / В.С. Зайцев – Челябинск, ЧГПУ, 2012. – Книга 1. – 411 с.

4. Веремейчик, Л.А. Методика преподавания агробиологических дисциплин: учебно-методический комплекс для слушателей педфака / Л.А. Веремейчик – Минск, УО БГАТУ. – 2002. – 146 с.

УДК 821.161.3-121

Валкалоўская Я.І., Русак В.У.

## СЕМАНТЫКА-СТЫЛІСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ КАЛАРАТЫЎНАГА ЭПІТЭТА «ЧЫРВОНЫ» Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»

*БДТУ, Мінск*

Колеравая і светлавая лексіка валодае істотным семантычным, сінтагматычным і выяўленчым патенцыялам, мае вялікае значэнне ў плане адлюстравання пэўных фрагментаў моўнай карціны свету мастака і забеспячэння эстэтычнага дыялогу паміж пісьменнікам і чытачом. Аналіз колераабазначэнняў дае магчымасць вызначыць асаблівасці ўжывання ў мастацкім тэксце адпаведных фарбаў, характар асацыятыўных сувязяў, якія пры гэтым узнікаюць.

Выбар паэтам прыярытэтных колераў – надзвычай складаны творчы акт, у якім маюць значэнне разнастайныя, усвядомленыя і падсвядомыя, фактары. Так, найважнейшым экстралінгвістычным (пазамоўным) фактарам выкарыстання колеравай лексікі можна лічыць уласцівыя пэўнаму менталітэту спадчынныя гістарычныя колеравыя сімвалы. Колеравыя характарыстыкі з глыбокай старажытнасці з’яўля-ліся адным з асноўных складнікаў нацыянальнага вобраза свету, выяўляючы асаблівасці асэнсавання навакольнай рэчаіснасці. Кожная нацыя жыве ў сваёй «сістэме каардынат», і ў карціне свету асноўныя вобразы нацыянальнага космасу падаюцца ў тым ліку і праз традыцыйныя колераапісанні.

Да лінгвістычных фактараў выбару лексічнай палітры адносіцца задума, змест і ідэя твора, адметнасць паэтычнага светабачання мастака, яго эстэтычныя густы і схільнасці. І, відавочна, на выбар

колеру немалаважны ўплыў аказвае псіхалагічны і нават фізічны стан аўтара, канкрэтная жыццёвая сітуацыя, у якой пісаўся твор.

У паэме «Новая зямля» пры скразным прачытанні было выяўлена 200 выпадкаў ужывання эпітэтаў са значэннем колеру і святла. Колькасныя падлікі зафіксаваных эпітэтаў адлюстраваны на дыяграме (малюнак).




Эпітэты са значэннем колеру
і святла ў паэме «Новая зямля»

Якуб Колас у паэме аддае бясспрэчную перавагу ахраматычнаму беламу колеру (46 ужыванняў з 200 зафіксаваных у паэме каларатыўных і светлавых эпітэтаў). На другім месцы по колькасці ўжывання знаходзіцца чырвоны колер (24 ужывання), які спрадвеку таксама быў адным з асноўных для славян. Славяне лічылі белыя і чырвоныя фарбы святымі і выкарыстоўвалі іх у адзенні, дэкаратыўным мастацтве, дойлідстве. У хрысціянскай традыцыі «белае-чырвонае» – знак Хрыстовай пакуты, пралітай за чалавецтва крыві. У паэме «Новая зямля» Якуб Колас аддае перавагу замацаванай ў народнай псіхалогіі, гісторыі і эстэтыцы семантыцы кода-апазіцыі «белы-чырвоны». Паэт часта называе гэтыя колеры побач: у *хустках белых і чырвоных*; *пампушка... чырвона зверху... ніз бялюткі*; *убраны хораша, бы ў свята: чырвоны колер, белы – усякі, бы ў агародзе тыя макі*; *над белым дахам, як карона, красуе комінак чырвоны.*

Акрамя таго, чырвоны колер лічыўся нашымі продкамі сімвалам агню, сонца і вечнага жыцця. З такім значэннем сустракаем гэты каларатыўны эпітэт (а таксама яго варыянты *агнявы, агністы, баграны, багра, крывавы*) і ў аналізуемай паэме:

*Наладзіў струны лес маўклівы*
*На лад вясёлы, на шчаслівы;*
*І толькісонцаў круг чырвоны*
*Асыпле золатам кароны*
*Высокіх хвой у тым бары*
*І кіне багру па кары*

*Лажыласьсонцапазалота*
*На верх лясоў чырвоным шляхам*

*Шчыты агнёвыя, кароны,*
*То ярка-светлы, то чырвоны*
*Шугае полымя бурліва*

*Дзянніца зоймецца шчасліва,*
*І ў ясным блеску і ў красе*
*Адб'юццахараша ў расе*
*Яекароны агнявыя*

*А там, на ўсходзе, пералівы*
*Агністых фарбаў робяць дзівы*

*Калі ў агністым мароз троне,*
*Ў крывава-багранай заслоне*

Яшчэ адна функцыя эпітэта *чырвоны* ў паэме «Новая зямля» – апісанне людзей у стане асаблівага псіхічнага ўзбуджэння, усхваляванасці ці павышанай фізічнай актыўнасці:

*І так абцёрсяён рукою,*
*Што губы й нос чырвоны сталі*
*І наватвусызатрашчалі*

*«Памдзей» задком, задком у дзверы*
*Паўзе-адходзіць ад навалы*
*І раптамробіць «махні-драла»,*
*Бяжыць на двор, увесь чырвоны*

*Восьедзеён, мастокмінае,*
*Аж хтось з-за паляўвылятае,*
*Як жар чырвоны дывяртлявы,*

*І хвошча пугай ўлева, ўправа*
*І па валах і па Пятрусю*

*Так і ўскіпіць, як рак чырвоны, –*
*Такі ён кручаны, шалёны!*

Блізкі да чырвонага *ружовы* колер у паэме найперш выкарыстоўваецца ў пейзажных замалёўках для апісання раніцы (усходу сонца) ці вячэрняга неба (заходу сонца):

*Ружовы захад повен ласкі,*
*І ціха звіслі агнепаскі*

*Скрозьшоўкнябёс ружова-белы*
*Рассыплюцьрадасныястрэлы*

*Ружова-бледна чырвань-ззянне,*
*Дзянніцы ціхае вітанне*

Заснавальнік тэорыі колераў, нямецкі паэт і вучоны І. В. Гётэ, які абгрунтаваў пачуццёва-эмацыянальнае і эстэтычнае ўздзеянне колераў і іх спалучэнняў, лічыў самы актыўны – чырвоны – колерам «сур’ёзнасці і годнасці» і разам з тым «невыноснага гвалту» [2, с. 46]. Відавочна, чырвоныя фарбы падкрэсліваюць драматычны, напружаныпадтэкст «Новай зямлі».

Што датычыць псіхалагічнага абгрунтавання такога колеравыбару, то, у адпаведнасці з тэстам вядомага швейцарскага вучонага М. Люшэра, для людзей, якія аддаюць перавагу чырвонаму, уласцівы сіла волі, імкненне да барацьбы, перамогі, лідарства, агрэсіўнасць, аўтаномнасць, энергічнасць [3, с. 70].

Колеравыя эпітэты ў творах Коласа выступаюць сродкам вобразнасці і выразнасці пры апісанні пэўных рэалій. Можна пагадзіцца з меркаваннем А. Бельскага, што «Коласава мастацкая палітра – моўна-выяўленчыя сродкі – шматаблічная, шматфарбная. З’явы, колеры, пахі, гукі ярка передае эпітэт» [1, с. 24]. Выбар колераў Коласам абумоўлены нацыянальнымі прасторавымі вымярэннямі, своеасаблівымі ўяўленнямі, што ўзнікаюць і зберагаюцца на ўзроўні генетычнага кода нацыі і садзейнічаюць захаванню яе духоўнай сутнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Бельскі, А. «Гарыць зямля ад фарбаў летніх...» Летаў беларускай паэзіі [працяг] / А. Бельскі //Роднае слова. – 1995. – № 7. – С. 24–29.

2. Гёте, И.В. Учение о цвете. Теория познания / И.В. Гёте. – М: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2012. – 200 с.

3. Dr. Max Luscher, The Luscher Color Test, edited by Ian A. Scott, Pocket Books / M. Luscher. – New York. 1971. –230 с.

4. Разладава, М. Этымалогія колераабазначэнняў беларускай мовы – М. Разладава // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С. 32–33.

5. Колас, Я.Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас.– Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы, 2009. – Т. 8: Паэма «Новая зямля». – С. 344.

УДК 378

Головко М.Д.

## СИТУАЦИОННЫЙ ПОДХОД ПРИ ИЗУЧЕНИИ УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «ПЕДАГОГИКА» БУДУЩИМИ ПЕДАГОГАМИ-ИНЖЕНЕРАМИ

*БНТУ, Минск*

На инженерно-педагогическом факультете осуществляется процесс подготовки педагогов-инженеров на основе ситуационного подхода, который обеспечивает у студентов развитие целеустремленности, инициативности, креативности, мобильности, умений работать в команде и самостоятельно. Акцент делается на усиление познавательной активности студентов.

В процессе подготовки студентов на учебной дисциплине «Педагогика» создаются оптимальные условия для реализации ситуационного подхода. Сущность ситуационного подхода заключается в том, что самореализация обучающихся осуществляется в процессе решения ими комплекса ситуационных задач, направленных на достижение целей формирования различных компонентов профессиональной компетентности. Анализируется текущая ситуация – учет внешних и внутренних педагогических условий. Ситуационный подход обеспечивает возможность увязать